■ З нагоды

# ПАМЯЦЬ І БОЛЬ

## У кожнага воіна-інтэрнацыяналіста ёсць рэчы, якія нагадваюць пра афганскія падзеі

**У адной з зал Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якая расказвае пра пасляваенныя ўзброеныя канфлікты, экспануецца кіцель Віктара Каралёва. Колішні намеснік камандуючага 40-й агульнавайсковай арміі па ўзбраенні, генерал-лейтэнант у адстаўцы — адзін з тых, хто адказваў за вывад войскаў з Афганістана.**

На працягу чатырох гадоў воін-інтэрнацыяналіст быў не толькі ў цэнтры афганскіх падзей, а і меў да іх непасрэднае дачыненне — даводзілася распрацоўваць баявыя аперацыі. А двойчы, што называецца, і сам быў паміж жыццём і смерцю. Падчас аблёту ў кастрычніку 1987 года гарнізонаў яго верталёт урэзаўся ў іншы самалёт. На шчасце, намеснік камандуючага абышоўся толькі страсеннем мозга, яго памочнік загінуў... Пашанцавала і тады, калі трапіў пад моцны абстрэл. Напамінам аб тых падзеях для Віктара Каралёва з'яўляюцца два ордэны Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу» і... карта, па якой камандуючы 40-й арміі генерал Громаў выводзіў савецкія войскі з Афганістана.

Карту, якая ў свой час лічылася абсалютна сакрэтнай і была бясцэннай для ворага, можна ўбачыць у музеі ў межах часовай экспазіцыі, прымеркаванай да 28-й гадавіны вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Тут і ўнікальная калекцыя дзяржаўных узнагарод СССР, Афганістана, юбілейных медалёў і памятных знакаў воінаў-інтэрнацыяналістаў Беларусі, Расіі, Казахстана, Украіны, Літвы і Малдовы, сабраная палкоўнікам у адстаўцы Уладзімірам Шокавым. І серыя карцін інваліда афганскай вайны Юрыя Стасюка, які падчас аперацыі пад Кандагарам атрымаў цяжкае раненне, у выніку чаго амаль страціў зрок. Некалькі агітацыйных лістовак, прадстаўленых на выставе, належаць воіну-інтэрнацыяналісту Ігару Шалудкову. У Афганістан ён трапіў маладым капітанам.

— Для мяне гэта не было нечаканасцю, — прызнаецца падпалкоўнік запасу. — Праз ваюючы Афганістан планавалася прапусціць максімальную колькасць кадравага складу арміі. Папярэдзілі пра гэта дзесьці за паўгода. Так што пра раптоўныя зборы казаць нельга. Можа, і былі адзінкавыя выпадкі, пра якія цяпер пішуць, але я такога не помню. Па-першае, строга сачылі, каб сям'я таго, хто з'язджае ў Афганістан, была забяспечана жылплошчай. Па-другое, усе праходзілі паглыбленую медыцынскую камісію для службы ў краінах з гарачым кліматам. Тых, хто, як кажуць, спрабаваў «закасіць» па здароўі, таксама не ўспомню.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



Выстава пабудавана на лёсах тых, хто не па чутках ведае, што такое Афганістан.

У складзе 5-й гвардзейскай мотастралковай дывізіі Ігар Шалудкоў служыў на захадзе Афганістана — прыкрываў іранскую мяжу, але часта ўдзельнічаў у баявых аперацыях і па ўсім поўдні. «Вайваць з мінімальнымі стратамі навучыліся хутка, — кажа воін-інтэрнацыяналіст. — Людзей бераглі, напралом ніхто не лез. Але вайна ёсць вайна. Больш за ўсё страт было ад падрыву на мінах. Што асабліва страшна, у асноўным гэта была моладзь...»

Службовая камандзіроўка ў Афганістан стала першай і апошняй для Ігара Адамава. На вайну ён трапіў будучы студэнтам 3-га курса Інстытута краін Азіі і Афрыкі. Выходзячы на чарговае баявое заданне, разам з ваенным саветнікам і радыстам ваенны перакладчык трапіў у засаду... Яго маці перадала ў музей трафейную амуніцыю і кабуру, якія належалі сыну, лістоўкі, што засталіся з далёкага 1981-га.

Куратар выставы Міхаіл Паваляеў таксама ўдзельнічаў у баявых дзеяннях у Афганістане. Служыў у разведвальным батальёне. «Акрамя таго, што мы неслі службу на заставах, даводзілася ахоўваць дарогі, аэрадром, трубаправод, — расказвае воін-інтэрнацыяналіст. — Пастаўка паліва адбывалася штодзень. Асабліва асцярожнасць трэба было праяўляць, калі ішла звычайная газа. Яна вельмі выбуханебяспечная, а душманы абстрэльвалі і днём, і ноччу. Страты былі велізарныя...»

Пазнаёміцца з лёсамі іншых ветэранаў вайны ў Афганістане праз іх асабістыя рэчы можна па 6 сакавіка ўключна. Дастаткова толькі прад'явіць білет у музей.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# ЗВЫЧАЙНАЯ АРМЕЙСКАЯ РАБОТА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Усяго за чатыры месяцы стаў кавалерам ордэна Славы, быў узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», потым атрымаў цяжкае раненне, якое выключыла службу ў разведцы. І хоць бацька не любіў расказваць пра ваенныя будні, недзе на ўзроўні падсвядомасці яго прыклад уплываў на светапогляд сына. Карацей, у армію ён прыйшоў па ўласным жаданні пасля праходжання ваеннай кафедры пры БДУ.

Леанід Пятровіч лічыць, што падрыхтоўку ў межах універсітэцкай ваеннай кафедры ён атрымаў даволі добрую. У той час многія з яе выкладчыкаў былі франтавікамі — падпалкоўнікі і палкоўнікі. Яны давалі рэальную базу ў плане навучання артылерыстаў.

Такім чынам, 21-гадовы Леанід Махніст у 1982 годзе паступіў на службу ў даволі вядомую тады 38-ю дэсантна-штурмавую брыгаду, якая дыслацыравалася ў Брэсце. Ну а ў тыя гады практычна ўсе дэсантнікі ў розны час накіроўваліся ў Афганістан. Так, у 56-й дэсантна-штурмавой брыгадзе, якая знаходзілася ў горадзе Гардэзе правінцыі Пакція, прыкладна за 130 кіламетраў ад Кабула, у 1985 годзе з'явіўся новы камандзір узвода старшы лейтэнант Махніст. Больш чым за два гады афганскай камандзіроўкі паспеў паслужыць намеснікам камандзіра батарэі, затым — памочнікам начальніка артылерыі брыгады.

— Што ўжо пра гэта гаварыць, 30 гадоў прайшло, звычайная армейская работа, — адказвае на мае пытанні былы «афганец».

Спрабую не пагадзіцца: мусіць жа не зусім звычайная, калі і сёння без запінкі называецца тэрмін тэтай работы: два гады, два месяцы і 16 дзён, а ў альбоме захаваліся тры календары, дзе кожны з гэтых дзён адзначаны. А яшчэ ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі», якія ўпрыгожваюць парадны кіцель, мабыць, былі б і іншыя баявыя ўзнагароды, але прадстаўленні часам губляюцца ў штабных кабінетах, так бывае на вайне...

Пытаюся ў Леаніда Пятровіча, з якім адчуваннем ён глядзіць цяперашнія фільмы, зробленыя на тэму вайны ў Афганістане. Кажа, што яны, мякка кажучы, не натхняюць:

— Там палова, калі не большая, таго, чаго не было насамрэч. Зразумела, што рэжысёрам, каб трымаць гледача, патрэбна рабіць стужку ў стылі баевіка, альбо паказваць абавязкова геразім і здраду амаль на мяжы фолу. У рэальнасці ўсё недзе складаней, а месцамі — прасцей. Часта наша жыццё там было звычайнымі буднямі, дзе мы стараліся максімальна ўладкаваць свой побыт, імкнуліся падтрымліваць адзін аднаго.

І яшчэ, нягоднікі ёсць заўсёды і ўсюды. Але там не было самаволкі, дзедаўшчыны, рукапрыкладства, што сустракаецца ў звычайных армейскіх калектывах, альбо здараліся выпадкі зусім адзінкавыя. Там гэтыя заганы вылечваюцца патрэбай калектывізму як надзейнага спосабу выжывання. А яшчэ мне вельмі пашанцавала з брыгадай, падабраліся надзвычай прыстойныя хлопцы-афіцэры, з якімі было добра служыць. І гэта важна, важней за многае іншае.

Усё, сапраўды, то прасцей, то складаней, чым паказваюць у фільмах. А жыццё, яно само па сабе не простае, — працягвае суразмоўца. — Цяпер часам успамінаю сваіх камандзіраў, тады падпалкоўнікаў. Адзін з іх, генерал-маёр Віталь Анатолевіч Раеўскі, па сутнасці, ствараў мабільныя сілы незалежнай Украіны. Яго ўжо, на жаль, няма з намі. Другі — генерал-палкоўнік Валерый Генадзевіч Яўневіч, герой Расіі, быў ваенным прадстаўніком Расіі пры НАТА... Ва ўсіх розныя лёсы, розныя дарогі пасля вайны. Галоўнае, вярнуцца з вайны жывым. А тым, хто вярнуўся, самым важным станавілася ўладкаваць далейшае жыццё.

Гвардыі капітан Махніст пасля вяртання з Афганістана яшчэ служыў у дэсантнай брыгадзе ў Брэсце. А пасля развалу Савецкага Саюза вырашыў звальняцца з арміі і рэалізоўваць сябе па асноўнай грамадзянскай спецыяльнасці. Нейкі час папрацаваў у Брэсцкім філіяле інстытута тэхнічнай кібернетыкі Акадэміі навук, а потым прыйшоў у тэхнічны ўніверсітэт. У графе анкеты «навуковыя інтарэсы» ён звычайна піша: функцыянальны аналіз, дыферэнцыяльныя ўраўненні, тэорыя імавернасцяў, нейронныя сеткі і іх дадаткі. У ваенкамаце яму неяк сказалі, што сярод воінаў-афганцаў ён адзіны матэматык з вучонай ступенню, і не толькі ў Беларусі. Можа, і так. Леанід Пятровіч не правяраў гэтую інфармацыю, але і калег сярод саслужыўцаў-інтэрнацыяналістаў не сустракаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ На слыху

# Ісці ў падатковую неабавязкова

### Заплаціць збор на фінансаванне дзяржвыдаткаў ці прадставіць «тлумачальную» можна праз інтэрнэт

**Грамадзяне, якія атрымалі паведамленне, але не абавязаны плаціць збор (напрыклад, працуюць за мяжой), могуць накіраваць свае даныя ў падатковы орган праз сэрвіс «Электронныя звароты» на сайце Міністэрства па падатках і зборах. Магчыма, гэтага тлумачэння будзе дастаткова, каб ануляваць паведамленне. Дакументы можна таксама даслаць па пошце.**

**Намеснік міністра па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА** падчас праграмы «Галоўны эфір» тэлеканала «Беларусь 1» нагадала, што на тое, каб прадставіць у падатковую тлумачэнні, якія сведчаць аб адсутнасці абавязку плаціць збор, даецца 30 дзён з моманту атрымання паведамлення. Калі тэрмін прапушчаны з уважлівых прычын, ён працягваецца яшчэ на месяц на падставе заявы грамадзяніна.

Заявы аб вызваленні ад падатку ў сувязі са складанай жыццёвай сітуацыяй трэба падаваць у мясцовыя выканаўчыя органы. Потым выканкамы апавяшчаюць падатковую аб прынятым рашэнні.

— Асноўнай мэтай Дэкрэта №3 з'яўляецца стымуляванне насельніцтва да працы, і гэта мэта была дасягнута. Многія грамадзяне, якія доўгі перыяд часу не працавалі, сталі звяртацца на біржу, рэгістравацца і шукаць работу. Многія таксама занялася прадпрымальніцтвам, — адзначыла Святлана Шаўчэнка.

Падатковыя органы накіравалі 470 тысяч паведамленняў на аплату збору. Каля 46 тысяч грамадзян ужо заплацілі яго, у бюджэт паступіла 14 мільёнаў рублёў. Тэрмін аплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў за 2015 год заканчваецца ў наступны панядзелак, 20 лютага. За неаплату ці несвоечасовую аплату прадугледжаны штраф у памеры ад 2 да 4 базавых велічынь ці адміністрацыйны арышт на тэрмін да 15 сутак з абавязковым прыцягненнем да грамадскіх работ.

■ Занятасць

# Узровень беспрацоўя вырас

### Але гэта традыцыйна для пачатку года

**На 1 лютага ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 0,9 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва. У параўнанні са студзенем беларусаў без работы стала на 4,6 тысячы больш — усяго 39,9 тысячы.**

Калі параўноўваць з тым, што было год таму, то сітуацыя на рынку працы палепшылася. Так, наймальнікамі заяўлена 39,3 тысячы свабодных месцаў: на 42 працэнты больш, чым у лютым мінулага года. Атрымліваецца, што на аднаго беспрацоўнага прыпадае адна вакансія (для параўнання — у лютым 2016-га каэфіцыент напружанасці на рынку быў 1,7). Пры гэтым у асобных рэгіёнах прапаноў больш за саіскальнікаў: у Магілёўскай вобласці прыходзіцца 0,9 беспрацоўных на свабоднае месца, у Гродзенскай — 0,8, у Мінску — 0,6.

Попыт на прадстаўнікоў рабочых прафесій складае 49 працэнтаў ад агульнай колькасці вакансій.

За студзень службамі занятасці было ўладкавана на пастаянную работу 9,5 тысячы чалавек, у тым ліку 7,6 тысячы беспрацоўных. На навучанне па запатрабаваных прафесіях за месяц накіравалі 308 чалавек. Пяці сем'ям аказалі садзейнічанне ў перасяленні на новае месца жыхарства і працы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*